ва адкрыцця друкарні і выдання навучальных і інш. кніг на бел., грэч., лац. і польск. мовах. У 1636—38 гэта права, відаць, перададзена брацтвам Спірыдону Собалю. У 1676 брацтва атрымала ад караля Яна III Сабескага прывілей на адкрыццё друкарні пры Богаяўленскім манастыры і выданне кніг на бел. і польск. мовах. З 1680 друкарню ўзначаліў Максім Вашчанка, які з 1698 выдаваў кнігі ад свайго імя. У 1701 брацтва дамаглося свайго ранейшага права на друкарню.

У канцы 17 — пач. 18 ст. друкарня выдала царк., павучальныя і палемічныя творы: «Псалтыр» (1693), «Акафісты і каноны» (1693), «Малітваслоў» (1695), «Дыоптра» (1698), «Перла мнагацэннае» і «Неба новае» (1699), «Трыфалагіён» (1754), «Часаслоў» (1762) і інш., многія з іх перавыдаваліся. У друкарні працавалі друкары і гравёры Васіль Вашчанка (сын М. Вашчанкі), Фёдар Ангілейка, Афанасій П., М. Антушкевіч (гл. таксама арт. *Магілёўская школа гравюры*). Друкарня адыграла значную ролю ў пашырэнні асветы на Беларусі.

*Літ.:* Ж у д р о Ф. История Могилевского Богоявленского братства.— Могилев, 1890; П і ч э т а У. І. Друк на Беларусі ў XVI і XVII ст.— У кн.: Чатырохсотлецце беларускага друку. Мн., 1926.

*М. Б. Батвіннік.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ ГУБЕРНСКАЯ ДРУКАРНЯ.** Існавала ў Магілёве ў 1833—1917. Друкавала *«Могилёвские губернские ведомости»* (1838—1917), «Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні» (1861—1916), «Агляды Магілёўскай губерні» (1879—1915), кнігі па пытаннях грамадскага і гасп. жыцця, справаздачы папячыцельства нар. цвярозасці, епархіяльнай вучылішчнай рады, суполкі міласэрных сясцёр, стат. камітэта, публічнай бібліятэкі і музея. Вывучэнню гісторыі, этнаграфіі і фальклору Магілёўшчыны прысвечаны кнігі «Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах» (1882—84) з прадмовай і пад рэд. А. С. Дэмбавецкага, «Гістарычны нарыс Магілёўскай губерні» М. В. Фурсава (1882), «Дзённік курганных раскопак, праведзеных... на працягу лета 1892 г. ў паветах Рагачоўскім, Быхаўскім, Клімавіцкім, Чэрыкаўскім і Мсціслаўскім» Фурсава і С. Ю. Чалоўскага (1892), «Беларускі зборнік. Вып. 6. Казкі» (1901), «Беларускія тэксты батлеечнага дзейства» Е. Р. Раманава (1898) і інш. На бел. мове надрукавала кн. «Тарас на Парнасе» і іншыя беларускія вершы» (1900). Выдавала маст. л-ру, бібліягр. каталогі і паказальнікі, 3 выпускі «Могилёвской старины» (1900, 1901, 1903). Усяго больш за 60 назваў кніг.

*Літ.:* Исторический очерк типографии в Могилёве.— Могилёвские губернские ведомости, 1863, № 21.

*Я. С. Умецкая.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА** імя М. А. Р ы м с к а г а - К о р с а к а в а, адна з першых дзярж. муз. школ у Сав. Беларусі. Створана ў 1919 (урачыстае адкрыццё адбылося 27 красавіка, у той жа дзень прысвоена імя Рымскага-Корсакава).

Сярод першых выкладчыкаў: А. Боркус, І. Каранеўская, І. Меркіна (фп.), А. Яўстратаў (скрыпка), Л. Юшкевіч (віяланчэль), Б. Браўдэ (духавыя інструменты), Б. Анчараў (сольныя спевы), Ю. Дрэйзін (гісторыя музыкі). Педагогі-інструменталісты рабілі ўклад у стварэнне пед. рэпертуару (фп. п'есы Боркуса, Каранеўскай). Першы выпуск (6 піяністаў, скрыпач, віяланчэліст, флейтыст) адбыўся ў 1923. У 1926 налічвалася ўжо 230 навучэнцаў. Да арганізацыі муз. вучылішча (1938) школа была асн. асяродкам муз. культуры ў горадзе. Пры ёй існавалі сімф. аркестр (з чэрв. 1919, дырыжор Я. Пеўзнер), хор (з 1921, кіраўнік А. Гарадзінскі), духавы аркестр і харэагр. група. Яны выступалі ў часцях Чырв. Арміі, рабочых клубах, выязджалі з агітканцэртамі ў вёску, удзельнічалі ва ўрачыстым пуску новых прамысл. прадпрыемстваў. Навучэнцы пад кіраўніцтвам педагогаў ставілі ўрыўкі з опер (у 1924 аркестр школы прыняў актыўны ўдзел у паўстаноўцы оперы М. Чуркіна «Вызваленне працы»).

На 1985/86 навуч. г. навучанне вядзецца па 14 спецыяльнасцях (тэрмін навучання ігры на фп., скрыпцы, віяланчэлі, альце 7 гадоў, на народных, духавых, ударных інструментах 5 гадоў). Аддзяленні фп., струннае, духавых і ўдарных інструментаў, нар., струнна-народных інструментаў, муз.-тэарэт. дысцыплін. Вял. ўвага аддаецца калектыўным формам навучання (існуюць 2 хоры, ансамблі скрыпачоў і віяланчэлістаў, вак. ансамбль, ансамбль ударных інструментаў, аркестры сімфанічны, духавы, рус. нар. інструментаў, баяністаў і акардэаністаў). З мэтай выяўлення музычна адораных дзяцей адкрыты філіялы школы (першы ў 1949; на базе філіяла пры Доме культуры аўтазавода ў 1966 створана Магілёўская дзіцячая муз. школа № 2). З 1959 пры М. дз. м. ш. працуе вячэрняя муз. школа агульнай муз. адукацыі.

*В. П. Масленікава.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ ДРУКАРНЯ,** М а г і л ё ў с к а я п р ы д в о р н а я д р у к а р н я. Існавала ў 1774—97. Засн. магілёўскім архіепіскапам, пісьменнікам, вучоным-славістам С. І. Богуш-Сестранцэвічам. Выдавала кнігі на рус., польск., лац. і франц. мовах. Вядома больш за 50 назваў, у т. л. трагедыя «Гіцыя ў Таўрыдзе» (1783) і гіст.-краязнаўчая праца «Аб Заходняй Русі» (1793) Богуш-Сестранцэвіча, «Кароткая французская граматыка» (1784, 1796), «Каляндар беларускіх намесніцтваў на 1783», «Каляндар беларускі» (1784—95).

*Літ.:* М а л ь д з і с А. І. Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі.— У кн.: Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн., 1974.

**МАГІЛЁЎСКАЯ КАФЛЯ,** архітэктурна-дэкаратыўная кераміка 15 — пач. 20 ст., якая выраблялася магілёўскімі цанінінікамі. Кафля канца 15—16 ст. гаршковая, з круглым вусцем, некат. вырабы пакрыты знутры зялёнай палівай. Кафля канца 16—20 ст. каробчатая (тэракотавая, зялёная паліваная, паліхромная). У аздабленні паліхромнай кафлі 17 ст. выкарыстоўвалі белую, зялёную, блакітную, карычневую, жоўтую паліву. У канцы 16—1-й пал. 17 ст. выраблялі кафлю з двухпрыступкавай рамкай на вонкавай пласціне. Паводле тыпаў і прызначэння М. к. падзяляецца на сценную, карнізную (простую, складаную і інш.), паясную, вуглавую, кафлі-перамычкі, гарадкі (каронкі). У аздабленні пашыраны раслінны (выява букета кветак у вазе, дубовыя і лаўровыя лісты, бутон хмелю і інш.) і геаметрычны (зігзагі, сетка, «рыбіна луска» і інш.) арнаменты, сюжэтныя, зааморфныя, геральдычныя, міфалаг. выявы (львы, арлы, грыфоны, анёлы, коннікі, гербы і інш.). У трактоўцы расліннага арнаменту, які часта спалу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаўся з геаметрычным, адметны ўплыў маньерызму (вырабы канца 16—1-й пал. 17 ст.), барока (сярэдзіна — 2-я пал. 17 ст.). Некат. кафлі датаваныя. Кафлю канца 17 — пач. 18 ст. часта аздаблялі т. зв. дывановым арнаментам, рэльефнымі выявамі. Кафля канца 18—19 ст. мае гладкую вонкавую пласціну, пакрытую пераважна зялёнай палівай. У канцы 19 — пач. 20 ст. паверхню вонкавай пласціны аздаблялі складаным рэльефным малюнкам.

*Літ.:* Володько Р. Ф. Белорусские изразцы.— Мн., 1978; Трусаў А. А., Чарняўскі І. М., Кукуня В. Р. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні гістарычнага цэнтра Магілёва.— Весці АН БССР. Сер. грамад. навук, 1983, № 5.

*А. А. Трусаў, І. М. Чарняўскі.*

**МАГІЛЁУСКАЯ КЕРА́МІКА,** традыцыйныя вырабы мясцовых рамеснікаў канца 15 — пач. 20 ст.: посуд, цацкі і інш. прадметы хатняга



**Магілёўская кераміка.** Збан. 17—18 ст. (злева); свяцільні. 18—19 ст. (уверсе справа); посуд. 17—18 ст.

ўжытку. Гаршкі з прамой шыйкай і касым ці закругленым краем венчыка, макотры ў канцы 15—16 ст. аздаблялі хвалістым арнаментам ці наколкамі, насечкамі. Традыцыі арнаментацыі непаліваных гаршкоў захоўваліся да 17—18 ст. З 16 ст. пашырылася вытворчасць паліванай і чорназадымленай керамікі. У 17—18 ст. выраблялі гаршкі, кубкі, куфлі, міскі, паўміскі, збаны, макотры, глякі, талеркі. Паліваны посуд (міскі і талеркі) упрыгожвалі арнаментам у выглядзе кругоў і кветак, збаны з вял. ручкай — адбіткам пальцаў на яе краях і арнаментам у выглядзе наляпных кветак на плечуках, куфлі аздаблялі выявамі гар. герба і пакрывалі зялёнай палівай. У 2-й пал. 17—18 ст. выраблялі посуд (талеркі, збаны), аздоблены ангобнаю размалёўкаю (геам. і раслінны арнамент). Выраблялі таксама кафлю (гл. *Магілёўская кафля*), дзіцячы посуд (кубачкі, талерачкі), падсвечнікі, рукамыйнікі, цэглу-пальчатку, непаліваную (плоскую і паўцыркульную) і паліваную зялёную дахоўку, магчыма, чорназадымленыя і паліваныя люлькі. Некаторыя віды посуду вывозіліся на продаж у Расію. Вырабы М. к. захоўваюцца ў Магілёўскім абл. краязнаўчым музеі.

*А. А. Трусаў, Н. І. Здановіч.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ МІКАЛА́ЕЎСКАЯ ЦАРКВА́,** помнік архітэктуры 2-й пал. 17 ст. Пабудавана ў 1669—72 у Магілёве ў стылі барока, воддаль ад цэнтра ў нізкай пойме Дняпра. Пашкоджана ў час пажару 1708.

Мураваная 3-нефавая, 3-апсідная крыжова-купальная базіліка з 8-гранным светлавым барабанам і цыбулепадобным купалам на сяродкрыжжы. Гал. фасад, вырашаны ў выглядзе вузкага аб'ёму, далучанага да цэнтр. нефа, падзелены карнізамі на 3 ярусы і завершаны 2 вежамі з фігурным франтонам паміж імі. Верхнія ярусы ўпрыгожаны



**Магілёўская Мікалаеўская царква.** Выгляд з боку апсіды і план.



**Магілёўская кафля** (злева направа): 17 ст., канца 17 — пач. 18 ст., канца 19 — пач. 20 ст.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУ